# Семяноўскі Багдан

Каб вясна хутчэй настала

Ручаёк бяжыць з падворка.

І сягоння не для ўцех

Шуфлік свой узяў Рыгорка.

Сонца дзівіцца здалёк,

А хлапчук працуе дбала –

Носіць снег у ручаёк,

Каб вясна хутчэй настала.

Ручаёк смялей пабег.

Сонца побач, на пагорку,

Плавіць, плавіць, плавіць снег ,

Памагаючы Рыгорку. Мікола Маляўка







# Кузьмянкоў Сямен
# Пчолка

Веснавое сонца
Росы падбірае.
Вылецела ў поле
Пчолка залатая.

Ёй за шчырай працай
Весела на полі:
Луг прыбраны ў
кветкі,
І наўкол раздолле.

З рання да змяркання
Пчолка залатая
Лётае па кветках
Ды мядок збірае.

## Янка Журба

Шмат сабрала пчолка
Мёду з розных кветак, –
Дома ім накорміць
Родных пчолак-дзетак.

У вуллі работа
Цэлы дзень кіпела.
Вечарам з дабычай
Пчолка прыляцела.





# Забрамскі Ілья

**Шпак** *Гадзіяна Кляшторная*



**На бярозцы пад акном**
**Я шпаку прыладзіў дом.**
**Толькі адысці паспеў –**
**Шпак адразу прыляцеў.**
**Дом утульны аглядае,**
**Песню весела спявае.**
**У шпака ёсць у двары**
**Вельмі добрыя сябры .**

# Ягор Кляпацкі

## Вясна

*Якуб Колас*

Ідзе вясна ўжо, дзякуй Богу!
Згінуў снег з сырой зямлі;
Папсавала гразь дарогу,
Перавалы загулі.

Сонца грэе, прыпякае;
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія крычаць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ўжо ляцяць.



# Петух Арсеній

Шпак  Тадзіяна Кляшторная

На бярозцы пад акном

Я шпаку прыладзіў дом.

Толькі адысці паспей –

Шпак адразу прыляцей.

Дом утульны аглядае,

Песню весела спявае.

У шпака ёсць у двары

Вельмі добрыя сябры.



# Няўжо вясна?

( Іван Муравейка )

— Вясна, вясна! — крычаць шпакі

.— Дзе? Дзе? — пытаюць ручайкі.

— Бяжым, мо стрэнем ля ракі!..

— Няўжо вясна? Адкуль? Калі? —

Здзівіўся парастак малы,

Не ўседзеў, выскачыў з зямлі.

**Чужова Аляксандра**



# Павел Саковіч “Коцікі”

На вярбе каля ракі
Коцікі паселі.
Можа, з поўдня, дзівакі,
Раптам прыляцелі?

Ды пушысценькія ўсе,
Цёмна-шэрай масці.
Вецер вербачку трасе –
Як бы ім не ўпасці.

Незвычайныя, відаць,
Тыя кацяняты,
Бо не мяўкаюць – маўчаць,
Не бягуць дахаты.

Зніклі коцікі цішком,
Хоць было іх многа…
Ах, шкада, не ўзяў я ў дом
З кацянят нікога!





Мікіта Цвірко

**Паўлюк Пранузa.** **«Я вясну малюю»** **Ушакевіч Софія**

Я вясну малюю,
Фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным —
Дрэвы і палеткі,
Колерам чырвоным —
Сонейка і кветкі.
Колерам блакітным —
Неба, ручаіну.
А якую фарбу
Воблачку пакіну?
Я вясну малюю,
Але сам бядую.
Як падаць мне песні
Жаўранкаў у высі?
Як падаць мне пахі
Траў, што разрасліся?
Як намаляваць мне,
Што спявае вецер?
Можа, ў вас ёсць фарбы?
Дайце мне іх, дзеці.



# Ніна Галіноўская “Вясновая бярозка”

*- Чаму ты, бярозачка,*
*гэтак прыбралася?*
*У госці да клёна,*
*напэўна, сабралася:*
*На кожнай галінцы*
*вісяць завушніцы,*
*Сукенка - сама*
*пазайздросціць царыца.*
*- Хто з добрай душою -*
*жаданы мой госць,*
*Для іх мой убор*
*і мая прыгажосць.*



Магер Мірон

# Пчолы і кветкі

Вось на ганачак вулля
Выйшлі пчолы спакваля.
Паглядзелі: што за дзень!
- Ці не май да нас ідзе?
- Шмат травы ўжо.
- Ды шкада
Шчодрых кветак не відаць!
- У кладоўцы хутка ў нас
Мёду скончыцца запас.
- Тэй, сястрыцы, гляньце:
Хто на лужку, вунь там?
- Бутон!
Падляцелі да яго:
- Добры дзень, бутончык!
- То!..
Ты чаго маўчыш?
- Чаму ты
Ў дзіўны дзень такі
Надзьмуты?!
І бутон расцвіў усмешкай:
- Ну і пчолкі! Ну й пацешкі!
За візіт такі вось зараз
Пачастуйцеся нектарам!..



Даніла Міхалькевіч

# Веснавая раніца

*Ціха абуджаюцца*
*Росныя палі,*
*Веснавая раніца*
*Крочыць па зямлі…*
*Промнямі агністымі*
*Саграе зямлю,*
*Зерні залацістыя*
*Кідае ў раллю́.*
*А як напрацуецца ,*
*На спачын ідзе,*
*Ніваю красуецца*
*Цэлы весні дзень*





Авяр’ян Дзеружынскі

Новікава Ульяна

# Я вясну малюю. Паўлюк Прануза

Я вясну малюю,
Фарбаў не шкадую.

Колерам зялёным —
Дрэвы і палеткі,
Колерам чырвоным —
Сонейка і кветкі.

Колерам блакітным —
Неба, ручаіну.
А якую фарбу
Воблачку пакіну?

Я вясну малюю,
Але сам бядую.

Як падаць мне песні
Жаўранкаў у высі?
Як падаць мне пахі
Траў, што разрасліся?

Як намаляваць мне,
Што спявае вецер?
Можа, у вас ёсць фарбы?
Дайце мне іх, дзеці.







**Семіжон Ксенія**

# Вясновы вечар

Алесь Ставер



Сонца ніненька зусім
Па-над небакраем,
І, здаецца, можна з ім
Стрэціцца за гаем.
Тaснуць промні - і за лес
Медны шар садзіцца
Адпачыць за ноч, каб лепш
Заўтра засвяціцца.

Скробат Паліна

# Сітавенка Марыя



## Няўжо вясна?

– Вясна, вясна! – крычаць шпакі.

– Дзе? Дзе? – пытаюць ручайкі.

– Бяжым, мо стрэнем ля ракі!..

– Няўжо вясна? Адкуль? Калі? –

Здзівіўся парастак малы,

Не ўседзеў, выскачыў з зямлі.

І. Муравейка



# Сябры вясны

*Нібы хлапчук,*
*Бяжыць раўчук*
*У госці да вясны.*
*Вітае песенькай жаўрук –*
*Нябёсаў сувязны.*

*Вясна ўсміхаецца, пяе*
*На полі і ў бары...*
*І мы спяшаем*
*Да яе,*
*Як лепшыя сябры.*

*Уладзімір Мазго*



Петрачэнка Ганна

# Няўжо вясна? *Іван Муравейка*





***– Вясна, вясна! – крычаць шпакі.***

***– Дзе? Дзе? – пытаюць ручайкі.***

***– Бяжым, мо стрэнем ля ракі!..***

***– Няўжо вясна? Адкуль? Калі? –***

***Здзівіўся парастак малы,***

***Не ўсёдзеў, выскачыў з зямлі.***

***Марнапольская Серафіма***

# Норка Сафія

*Я вясну малюю,*
*Фарбаў не шкадую.*
*Колерам зялёным –*
*Дрэвы і палеткі,*
*Колерам чырвоным –*
*Сонейка і кветкі.*
*Колерам блакітным –*
*Неба, ручаіну.*
*А якую фарбу*
*Воблачку пакіну?*
*Я вясну малюю,*
*Але сам бядую.*
*Як падаць мне песні*
*Жаўранкаў у высі?*
*Як падаць мне пахі*
*Траў, што разрасліся?*
*Як намаляваць мне,*
*Што спявае вецер?*
*Можа, ў вас ёсць фарбы?*
*Дайце мне іх, дзеці.*





# Пчолка (Янка Журба)





Веснавое сонца
Росы падбірае.
Вылецела ў поле
Пчолка залатая.

Ёй за шчырай працай
Весела на полі:
Луг прыбраны ў кветкі,
І наўкол раздолле.

З рання да змяркання
Пчолка залатая
Лётае па кветках
Ды мядок збірае.



Шмат сабрала пчолка
Мёду з розных кветак, -
Дома ім накорміць
Родных пчолак-дзетак.

У вуллі работа
Цэлы дзень кіпела.
Вечарам з дабычай
Пчолка прыляцела

Голава Марыя

Янка Журба -Пчолка

Веснавое сонца
Росы падбірае.
Вылецела у поле
Пчолка залатая.
Ёй за шчырай працай
Весела на полі:
Луг прыбраны ў кветкі,
І наўкол раздолле.

Зрання да змяркання
Пчолка залатая
Лётае па кветках
Ды мядок збірае.
Шмат сабрала пчолка
Мёду з розных кветак, –
Дома ім накорміць
Родных пчолак-дзетак.

Клышэўская Елізавета



# Жук Ульяна

Я вясну малюю,
Фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным –
Дрэвы і палеткі,
Колерам чырвоным –
Сонейка і кветкі.
Колерам блакітным –
Неба, ручаіну.
А якую фарбу
Воблачку пакіну?
Я вясну малюю,
Але сам бядую.
Як падаць мне песні
Жаўранкаў у высі?
Як падаць мне пахі
Траў, што разрасліся?
Як намаляваць мне,
Што спявае вецер?
Можа, ў вас ёсць фарбы?
Дайце мне іх, дзеці.

Паўлюк Прануза



# Я вясну малюю

**Я вясну малюю,**

**Фарбаў не шкадую.**

**Колерам зялёным —**

**Дрэвы і палеткі,**

**Колерам чырвоным —**

**Сонейка і кветкі.**

**Колерам блакітным —**

**Неба, ручаіну.**

**А якую фарбу**

**Воблачку пакіну?**



**Волкава Марыя**